*Ларыса Ляхові́ч (Мінск)*

# САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ ВА ЎМОВАХ ЕЎРАПЕЙСКАГА АБСАЛЮТЫЗМУ (КАНЦЭПЦЫЯ М. І. КАРЭЕВА)

Комплекс пытанняў, звязаных з палітычнай гісторыяй і грамадскім ладам Рэчы Паспалітай, традыцыйна прыцягваў увагу гісторыкаў, якія займаліся ўласна гісторыяй Расіі. Разам з тым вельмі прадукцыйным з’яўляецца разгляд праблем развіцця Рэчы Паспалітай спецыялістамі па ўсеагульнай гісторыі ў еўрапейскім кантэксце з выкарыстаннем аналогій, параўнання, сінхранізацыі.

Даследаванне новай гісторыі прайшло ў дарэвалюцыйнай Расіі больш цяжкі шлях, чым вывучэнне антычнасці ці сярэднявечча. Выкладанне вялося ў асноўным па замежных дапаможніках, амаль не было падрыхтоўкі адпаведных спецыялістаў. Разгляд матэрыялу даходзіў да сярэдзіны XVIII ст., аналіз Вялікай французскай рэвалюцыі быў забаронены. Наогул, нядаўнія падзеі былі «несур’ёзнымі» і непрэстыжнымі для вывучэння. Сітуацыя змянілася толькі з 1960-х гадоў, калі былі зняты цэнзурныя абмежаванні. Пры гэтым прасочваецца яскравая тэндэнцыя. Так, калі Т.М. Грановскі (1813—1855) даводзіў свой матэрыял да Рэфармацыі, то заснавальнік «рускай школы» новай гісторыі У.І. Гер’е (1837—1919) — да Вялікай французскай рэвалюцыі, а яго вучні М.І. Карэеў (1850—1931) і Р.Ю. Віпер (1859—1954) — да сучаснай ім рэчаіснасці. Сучаснікам здавалася такое становішча нязвыклым і мала прымальным. Так, П.М. Мілюкоў узгадваў: «Курсы новай, а асабліва найноўшай гісторыі ў нас здаваліся чамусьці абавязкова ненавуковымі, і я памятаю наша агульнае неадабрэнне, калі такі курс гісторыі XIX ст. пачаў чытаць у Пецярбургу прафесар М.І. Карэеў» [1, с. 100—101].

У канцы XIX — пачатку XX ст. склалася «руская школа» новай гісторыі, заснавальнікам якой быў прафесар Маскоўскага ўніверсітэта У.І. Герье. Ён стаў настаўнікам цэлай плеяды гісторыкаў, сярод якіх М.М. Карэеў, П.Г. Вінаградаў, П.Н. Ардашаў, Р.Ю. Віпер і іншыя. М.І. Карэеў (1850—1931) — адзін з буйнейшых прадстаўнікоў ліберальнай гістарыяграфіі Расіі. Больш за тое, Карэева можна лічыць першым прафесійным метадолагам гістарычнай навукі ў Расіі, што прызнавалася ўжо яго сучаснікамі [2] і не абвергнута ў нашы дні [3, с. 49]. Навуковая спадчына М.І. Карэева адлюстравана ў гістарыяграфіі, аднак шэраг прыватных пытанняў застаўся за мяжой даследаванняў.

Так, у гістарыяграфічным аглядзе «Навука новай гісторыі ў Расіі» працы М. І. Карэева разглядаюцца ў агульным кантэксце развіцця расійскай навістыкі і датычацца праблематыкі Французскай рэвалюцыі [4, с. 150—152]. У даследаванні У.П. Бузескула вельмі высока ацэньваецца грунтоўная праца Карэева — «Гісторыя Заходняй Еўропы ў новы час»; адзначаецца, што па шырыні маштаба, дакладнасці і аб’ектыўнасці роўных гэтай працы няма ні ў рускай, ні ў заходнееўрапейскай літаратуры [5, с. 164].

У пасляваеннай савецкай гістарыяграфіі канцэпцыя Карэева аналізавалася ў «Нарысах гісторыі гістарычнай навукі ў СССР», дзе разглядалася з пункту гледжання марксізму. «Гісторыя Заходняй Еўропы» была ацэнена як праца эклектычная, без паслядоўнай канцэпцыі і састарэлая яшчэ да свайго з’яўлення [6, с. 260—262, 476—481]. Пры гэтым крытычна расцэнена і інтэрпрэтацыя Карэевым прычын Вялікай французскай рэвалюцыі [7, с. 461]. У даследаванні Я.У. Гутновай утрымліваецца больш падрабязны матэрыял, узгаданы такія працы Карэева, як «Памесце-дзяржава і саслоўная манархія сярэдніх вякоў» і «Заходнееўрапейская абсалютная манархія XVI — XVIII стст.», а таксама вызначана, што пры разглядзе саслоўнай і абсалютнай манархіі Карэеў вызначае іх класавыя функцыі [8, с. 319—322].

М.І. Карэеву прысвечаны шэраг прац В.П. Залатарова, аднак нават у самых грунтоўных з іх Карэеў выступае ў першую чаргу як метадолаг, а з прыватных гістарычных праблем разглядаецца Вялікая французская рэвалюцыя [9; 10]. Асоба і дзейнасць М.І. Карэева прыцягвалі ўвагу такіх даследчыкаў, як Г.П. Мягкоў, А.В. Малінаў, А.В. Федзякін [11— 13], аднак нават у інтэграваным разглядзе зместу гісторыка-культуралагічнай канцэпцыі Карэева Г.П. Мягковым Еўропа ранняга Новага часу прадстаўлена толькі фіксацыяй з’яў Рэфармацыі і каталіцызму. Разнастайным аспектам тэарэтычнай спадчыны М.І. Карэева адводзіцца значнае месца ў даследаваннях Т.І. Сідненка. Пры гэтым асноўны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

акцэнт зроблены на метадалагічных асновах канцэпцыі Карэева, якая разглядаецца ў кантэксце развіцця расійскай і еўрапейскай ліберальнай думкі [14]. Развіццю расійскай гістарыяграфіі дарэвалюцыйнага перыяду прысвечаны працы А. Н. Нечухрына; пры гэтым навуковы ўнёсак М. І. Карэева ўключаны ў агульны кантэкст даследаванняў [3; 15; 16].

Такім чынам, праблематыка Еўропы ранняга Новага часу ў працах М. І. Карэева практычна не знайшла адлюстравання ў гістарыяграфічных даследаваннях. Не закранацася і тэма сацыяльна-палітычнага развіцця Рэчы Паспалітай, што было б актуальным з пазіцыі айчыннай гісторыі. Між тым сам М. І. Карэеў, выкладаючы ў 1879—1884 гг. у Варшаўскім універсітэце, надаваў вялікае значэнне гісторыі Рэчы Паспалітай і займаўся высвятленнем прычын, якія прывялі да яе знікнення. Сведчаннем гэтаму з'яўляецца капітальная гістарыяграфічная праца Карэева «Падзенне Польшчы ў гістарычнай літаратуры» [17], у высновах якой указваецца, што Рэч Паспалітая пала з прычыны сваёй унутранай анархіі («безурядицы») [17, с. 376]. Аналізу гістарычнага шляху Рэчы Паспалітай і вызначэнню перадумоў яе аслаблення прысвечаны шэраг даследаванняў Карэева, у якіх гэта дзяржава ўключана ў еўрапейскі кантэкст.

Новы час у Еўропе да 1789 г. характарызуецца Карэевым як перыяд умацавання каралеўскай улады, узорнай дзяржавай у гэтым сэнсе з'яўляецца Францыя. Ужо ў пачатку XVI ст. французскі кароль адпавядаў тыпу абсалютнага манарха, а ў XVII ст. Рышэлье і Людовік XIV стварылі сістэму, якая была знішчана толькі падчас рэвалюцыі 1789 г. Разам з тым, на думку Карэева, першыя манархі, якія не былі звязаны з феадальным партыкулярызмам, з'явіліся ў італьянскіх гарадах-рэспубліках, дзе ў выніку палітычнай барацьбы ўсталявалася неабмежаваная княжацкая ўлада. Аслабленне саслоўна-прадстаўнічых устаноў назіралася па ўсёй Еўропе, нават Англія з парламентам адчула на сабе ўмацаванне каралеўскай улады ў XV — першай палове XVII ст., пакуль рэвалюцыя не скасавала абсалютызм Карла I. У раздробленай Германіі ідэя абсалютызму перанеслася на княжацкую ўладу [18, с. 83—84, 86].

Новы час — гэта ў першую чаргу перыяд абсалютызму, аднак абсалютная манархія не была тады адзінай палітычнай формай. Як альтэрнатыўны варыянт Карэеў узгадвае землі Германіі, якія былі чымсьці сярэднім паміж адзінай дзяржавай і міжнародным саюзам дзяржаў і не паддаваліся класіфікацыі.

Не менш своеасаблівай была Рэч Паспалітая. Карэеў прасочвае генезіс Польскай дзяржавы з ранняга сярэднявечча, ужо ў гэты перыяд заўважаючы перадумовы будучых праблем. Адзначаецца паступовае выцясненне Польшчы з захаду і рух на ўсход Еўропы. Польшча стварылася позна, каб з поспехам змагацца з немцамі на Эльбе; прыняцце каталіцызму адкрывала дадатковыя магчымасці для германскага ўплыву. У XV ст. з'явілася падстава для польска-чэшскага саюзу ў выніку барацьбы супраць германізацыі, але каталіцкія іерархі Польшчы не пайшлі на збліжэнне з гусітамі. Вызначальнымі памылкамі польскай манархіі Карэеў лічыў упушчаныя магчымасці вярнуць пад уплыў польскай кароны Сілезію і Памор'е, дапушчэнне кіравання Габсбургаў у Чэхіі і Венгрыі і зацвярджэнне правоў на Прусію за нашчадкамі Брандэнбургскага дома. Нават у перыяд Трыццацігадовай вайны Рэч Паспалітая магла б падтрымаць Чэхію, умацаваць свой уплыў на паўночным усходзе Германіі, але быў выбраны шлях супрацоўніцтва з Габсбургамі і каталіцызмам. Уладзіслаў IV завяршыў шэраг памылак польскай манархіі, аддаўшы Прусію Брандэнбургу і адмовіўшы кардыналу Рышэлье ў прапанове ўступіць у антыгабсбургскі саюз [19, с. 177—185]. Узмацніўшы такім чынам Габсбургаў і Гогенцолернаў, не маючы трывалых сфер уплыву, Польшча зрабілася апірышчам каталіцызму, а «пры такім характары польскага панавання на рускіх землях адпадзенне іх ад Рэчы Паспалітай было толькі пытаннем часу» [19, с. 198].

Рэлігійнае жыццё Рэчы Паспалітай мела альтэрнатывы развіцця. Карэеў указвае на вялікую верацярпімасць і рэлігійную свабоду ў гэтай дзяржаве ў перадрэфармацыйныя і рэфармацыйныя часы. Па сутнасці, ніякіх сур'ёзных супярэчнасцей паміж Рымам і Рэччу Паспалітай, манархіяй і грамадствам не існавала, за выключэннем саперніцтва паміж дваранствам і духавенствам; у ёй не было расколу, як у Англіі, на прыхільнікаў епіскапальнай царквы з ідэяй абсалютызму і ідэолагаў народаўладдзя з радыкальным пратэстантызмам, яна не магла параўноўвацца і з Германіяй, на поўначы якой Рэфармацыя мела ўсенародную падтрымку [20, с. 27—29, 61—63, 76]. У такіх умовах Жыгімонт II Аўгуст мог правесці рэфармацыю «зверху», умацаваць манархічную ўладу, але гэтага зроблена не было, і ў значнай меры таму, што па асабістых якасцях гэты манарх не быў прыгодны для такой місіі [20, с. 75—76, 83—84, 102—104]. Вынікам было ўсталяванне каталіцызму, аслабленне манархічнай улады, што адбывалася паралельна з пашырэннем шляхецкіх вольнасцей. Шляхецкі прынцып развіваўся ў адным вядомым кірунку, і не пратэстантызм, ні езуіты на гэта не ўплывалі [20, с. 27—28].

М. І. Карэеў характарызуе дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай у кантэксце пабудовы заходнееўрапейскіх дзяржаў. Так, супастаўляецца палітычны лад гэтай дзяржавы і германскіх зямель, у якіх усталяваліся ні манархія, ні арыстакратыя, ні дэмакратыя, а нейкая, па выражэнні нямецкага юрыста С. Пуфендорфа, пачвара, хаос імперскай пабудовы, і толькі ў некаторых частках імперыі развіваўся княжацкі абсалютызм. Не менш дзіўнай была пабудова і «найсвятлейшай польскай рэспублікі» — Рэчы Паспалітай, аб якой самі палякі казалі як аб адсутнасці парадку («безнарядье») [21, с. 401].

Узмацненне і адасабленне польскай шляхты прыйшлося на XIII — пачатак XIV ст., калі польскаму каралю Уладзіславу Лакетку была патрэбна падтрымка землеўладальніцкага дваранства ў су-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працьвагу магнатам. Шляхта з'яўляецца на соймах, ствараючы «пасольскую ізбу», не дзелячы сваё прадстаўніцтва ні з гаражанамі, ні тым больш з сялянамі. Гарады Польшчы ў той час былі моцна германізаваныя, задаволеныя атрыманымі прывілеямі і не мелі патрэбы ў адстойванні сваіх правоў. Калі ж у XVI ст. праходзіла паланізацыя гарадоў, то мяшчанам было ўжо позна прэтэндаваць на месца ў сойме, дзе дамінавала адна шляхта [22, с. 12—13].

Сойм у Польшчы меў дзве асаблівасці ў параўнанні з аналагічнымі прадстаўнічымі органамі ў іншых дзяржавах. Гэта, па-першае, удзел у ім толькі шляхты, што зрабіла гэту ўстанову сродкам адстойвання вузкасаслоўных інтарэсаў, прычым на шкоду іншым саслоўям. Па-другое, сойм, юрыдычна будучы прадстаўніком адной дзяржавы, фактычна атрымліваў характар міжнароднага кангрэса паслоў ад нібыта самастойных земель. Такі кангрэсіўны характар прывёў да развіцця прынцыпа liberum veto, які меў вядомыя наступствы і прыводзіў да павышэння ролі соймікаў. Такім чынам, адбыўся «захоп вярхоўнай улады адным саслоўем і няўменне арганізаваць уладу, якая апынулася ў яго руках... Шляхта... хутчэй дэзарганізавала тое, што было арганізавана раней... Гэты «рымскі народ» не меў ні магістратаў, ні народных каміцый» [22, с. 8—10]. «Атамізацыя» Польшчы зрабілася магчымай па прычыне таго, што падзенне старой улады, г. зн. улады каралеўскай, не суправаджалася заснаваннем соймавай. Прычыну кангрэсіўнасці Карэеў бачыць у тым, што ў Польшчы не адбылося трывалага аб'яднання земель, краіна сабралася «раптам і хутка». Са спыненнем дынастыі Пястаў працэс аб'яднання затармазіўся, і пачалося кіраванне «мажнаўладства» [22, с. 16—17]. Абмежаванне каралеўскай улады павялічвалася, а «вольная элекцыя» і liberum veto толькі паказвалі размах гэтай з'явы. Калі ў большасці еўрапейскіх краін усталяваўся абсалютызм, Рэч Паспалітая ператварылася ў рэспубліку з захаваннем манархічнага тытула, а сойм быў такі, што, па словах Ж.-Ж. Русо, «нішто над ім не пануе, але нішто яму і не падпарадкоўваецца» [22, с. 8, 44—45].

Эпоха Контррэфармацыі ў Рэчы Паспалітай характарызуецца Карэевым адмоўна. Галоўнымі дзеячамі каталіцкай рэакцыі ў Еўропе былі іспанскія і аўстрыйскія Габсбургі, і на службе Контррэфармацыі знясілілі сябе дзяржавы, якія дзейнічалі ў іх інтарэсах. Гэта Іспанія, Аўстрыя і германскія землі. М.І. Карэеў сцвярджае, што Рэч Паспалітая ў XVIII ст. згубіла сябе сувяззю з каталіцкай рэакцыяй [21, с. 296]. Інтэлектуальнае і літаратурнае жыццё перажывалі ў гэтай дзяржаве заняпад у XVII ст. у параўнанні з XVI, і толькі XVIII ст. вывела яе з застою. Разглядаючы ўнутранае развіццё Рэчы Паспалітай, Карэеў адзначае неразвітасць «трэцяга саслоўя», нязначны працэнт гарадскога насельніцтва, якое складалася галоўным чынам з яўрэяў. Гарады і прамысловасць былі развіты мала, юрыдычны стан мяшчан быў незавідным [23, с. 89].

Сур'ёзнымі былі недахопы дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай, якія ўмела выкарыстоўваліся суседзямі. Карэеў адзначае, што ў новы час «урады лічылі не толькі выгадным для сябе, калі ў суседзяў узнікалі бунты і міжусобіцы, але нават самі падтрымлівалі і выклікалі такія ўнутраныя замяшальніцтвы, якія аслаблялі суседзяў... Кацярына ІІ прама заяўляла, што яна не дапусціць у Рэчы Паспалітай «самадзяржаўя», пад якім яна разумела ўсякае, хаця б самае нязначнае ўзмацненне каралеўскага ўрада» [23, с. 143]. Падобныя адносіны з боку суседзяў адчувала і Швецыя падчас алігархічнага праўлення, якая тым не менш змагла пераадолець унутраныя складанасці.

Як вядома, абсалютызм у Рэчы Паспалітай не меў месца, аднак Карэеў узгадвае ў шэрагу прадстаўнікоў асвечанага абсалютызму Станіслава-Аўгуста Панятоўскага, які, хаця не быў абсалютным манархам, выступіў у ролі рэфарматара [23, с. 295].

Рэформы ў Рэчы Паспалітай напярэдадні яе падзелаў мусілі вырашаць «зверху» тыя ж задачы, што і ў іншых дзяржавах «асвечанага дэспатызму». Францыі такія рэформы «зверху» правесці не ўдалося, і вынікам стала рэвалюцыя — правядзенне рэформ «знізу». Карэеў праводзіць аналогію паміж мерапрыемствамі асвечанага абсалютызму, Вялікай французскай рэвалюцыі і польскімі рэформамі, разглядаючы іх як з'явы аднаго парадку [24, с. 1—3]. Апошняму манарху каралю Рэчы Паспалітай давялося дзейнічаць ва ўмовах адсутнасці ў яго рэальнай улады, дзеяздольнага бюракратычнага апарата, усеўладдзя дваранства і духавенства, інертнасці мяшчанства і сялянства, пастаяннага ўплыву замежных дзяржаў, у прыватнасці Расіі. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, нягледзячы на свае станоўчыя якасці, не меў дастаткова моцнага характару і не быў здольны на радыкальныя дзеянні [24, с. 4—6, 52—55]. Рэформы ў краіне спазніліся, знешнія абставіны не далі ім рэалізавацца. З другога боку, Карэеў адзначае, што Рэч Паспалітая як адна з найбольш адсталых еўрапейскіх дзяржаў не мела ў поўнай меры і тых перадумоў для рэфармавання, як іншыя краіны. У гэтым сэнсе рэформы пачаліся не надта позна, а надта рана. На Захадзе ішла пабудова дзяржавы, а ў Рэчы Паспалітай — яе разлажэнне. Патрэбна было вярнуцца, піша Карэеў, у XVI ст., сойм павінен быў пераважаць над соймікамі, выканаўчая ўлада мець большую самастойнасць, шляхта — спыніць сваё існаванне ў якасці ўсяго народа, мяшчанства — атрымаць больш, чым дапушчэнне некаторых яго прадстаўнікоў да шляхецтва, а сяляне — мець апеку законаў не толькі на словах. Канстытуцыя 3 Мая была толькі першым крокам, а не завяршальным. Да гэтага дадаліся рэлігійная нецярпімасць і адсутнасць апоры ў грамадстве, таму што «ў Польшчы з самага пачатку ніхто не думаў аб выратаванні палітычнага быцця шляхам народнага руху» [24, с. 82—84, 173—177].

Патрэбна адзначыць, што даследаванні расійскай ліберальнай гістарыяграфіі былі выкарыстаны, хаця і ў метадалагічна змененым выглядзе, у наступныя перыяды. Адзначанае датычыцца і прац М.І. Карэева, у тым ліку па гісторыі Рэчы Паспалітай.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГПУ

## ЛІТАРАТУРА


1. Сафронов Б.Г. Историческое мировоззрение Р.Ю. Виппера и его время. — М., 1976. — 220 с.
2. Перцев В.Н. Новые труды по теории исторической науки // Голос минувшего: Журнал истории и истории литературы. — 1914. — № 4. — С. 269.
3. Нечухрин А.Н. Методологические основы российской историографии в 80-е гг. XIX в. — 1917 г. (смена парадигм) // Наш радавод: Царква і культура народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі XIII — пач. XX ст.: Матэрыялы міжнар. навук. канф., Гродна, 28 верас. — 1 кастр. 1992. — Гродна, 1994. — Кн. 6., ч. 1. — 217 с.
4. Бутенко В. Наука новой истории в России // Анналы: журнал всеобщей истории. — 1922. — № 2. — С. 129—167.
5. Бузескул В.П. Всеобщая история и ее представители в России в XIX и начале XX века: В 2 ч. — Л., 1929. — 218 с.
6. Очерки истории исторической науки в СССР: В 3 т. / Под ред. М.В. Нечкиной (гл. ред.). — М., 1963. — Т. 3. — 831 с.
7. Очерки истории исторической науки в СССР: В 3 т. / Под ред. М.В. Нечкиной (гл. ред.). — М., 1960. — Т. 2. — 862 с.
8. Гутнова Е.В. Историография истории средних веков. — 2-е изд. — М., 1985. — 479 с.
9. Золотарев В.П. Историческая концепция Н.И. Кареева: содержание и эволюция. — Л., 1988. — 160 с.
10. Золотарев В.П. Общая теория истории в понимании Н.И. Кареева // Новая и новейшая история. — 2003. — № 2. — С. 29—43.
11. Мягков Г.П. Научное сообщество в исторической науке: опыт «русской исторической школы». — Казань, 2000. — 298 с.
12. Малинов А.В. Цивилизационное единство всемирной истории: философия истории Н.И. Кареева // Журнал социологии и социальной антропологии. — 2000. — Т. 3, № 4. — С. 99—104.
13. Федякин А.В. Н.И. Кареев // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 12: Политические науки. — 2004. — № 2. — С. 118—138.
14. Сидненко Т.И. Либеральное направление отечественной историографии в конце XIX — начале XX в.: Автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.09. — СПб., 2007. — 37 с.
15. Нечухрин А.Н. Проблема соотношения истории и современности в русской либеральной историографии (80-е гг. XIX в. — 1971 г.): Автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.09. — Томск, 1979. — 21 с.
16. Нечухрин А.Н. Смена парадигм в российской историографии всеобщей истории (80-е гг. XIX в. — 1917 г.): Автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.03. — Минск, 1993. — 49 с.
17. Кареев Н.И. «Падение Польши» в исторической литературе. — СПб., 1888. — 407 с.
18. Кареев Н.И. История Западной Европы в новое время: развитие культурных и социальных отношений: В 3 т. —5-е изд. — СПб., 1914. — Т. 1: Переход от средних веков к новому времени. — 422 с.
19. Кареев Н.И. Polonica: сборник статей по польским делам (1881—1905). — СПб., 1905. — 268 с.
20. Кареев Н.И. Очерк истории реформационного движения и католической реакции в Польше. — М., 1886. — 192 с.
21. Кареев Н.И. История Западной Европы в новое время: развитие культурных и социальных отношений: В 3 т. — 5-е изд. — СПб., 1915. — Т. 2: История XVI и XVII веков. — 640 с.
22. Кареев Н.И. Исторический очерк польского сейма / Н.И. Кареев. — М.: Тип. А.И. Мамонтова и К°, 1888. — 162 с.
23. Кареев Н.И. История Западной Европы в новое время: развитие культурных и социальных отношений: В 3 т. — 5-е изд. — СПб., 1913. — Т. 3: История XVI и XVIII века. — 680 с.
24. Кареев Н.И. Польские реформы XVIII века. — СПб., 1890. — 183 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Лариса Ляхович*

# СОЦИАЛЬНО-ПОЛИТИЧЕСКОЕ РАЗВИТИЕ РЕЧИ ПОСПОЛИТОЙ В УСЛОВИЯХ ЕВРОПЕЙСКОГО АБСОЛЮТИЗМА (КОНЦЕПЦИЯ Н.И. КАРЕЕВА)

*Резюме*

В статье анализируется социально-политическое развитие Речи Посполитой в раннее Новое время в контексте формирования и функционирования абсолютистских монархий на европейском континенте согласно концепции представителя российской либеральной историографии Н.И. Кареева (1850—1931). Отмечены особенности формирования данного государства, альтернативы ее религиозного развития, специфика организации сейма, причины возвышения и господства шляхты, особенности геополитического положения, а также причины проведения реформ накануне разделов государства. Данные вопросы рассматриваются в контексте политического развития Европы раннего Нового времени.

**_Larisa Liachovich_**

# THE SOCIAL AND POLITICAL DEVELOPMENT OF RECH POSPOLITA UNDER THE EUROPEAN ABSOLUTISM (N. I. KAREEV'S CONCEPTION)

*Summary*

The article contains the analysis of the view on social and political development of Rech Pospolita in the early modern period within the context of formation and functioning of absolute monarchies on the continent according to the concept of the foremost representative of Russian liberal historiography N.I. Kareev (1850–1931). Attention is given to the peculiarities of Rech Pospolita formation, religious development alternatives, Sejm organization specifics, reasons for rise and supremacy of the Polish gentry, specific features of geopolitical state and the reasons for introduction of reforms on the eve of fragmentation of the state. These issues are examined within the context of political development in Europe of the early modern period.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ